А Пакацігарошак з *(раніца)* да вечара па *(сцежка-дарожка)* на *(самакат)* катаецца. А каб дапамагчы адной ці другой *(сястрычка)* — *(Моркаўка)* або *(Капустачка)*, — пра гэта нават і не думаў! *(Паводле А. Бутэвіча)*.

Падумайце, як развіваліся падзеі далей. Які можа быць працяг казкі? Уявіце сітуацыю, калі Моркаўка і Капустачка звяртаюцца да Пакацігарошка і: 1) просяць у яго дапамогі па гаспадарцы; 2) павучаюць, як трэба ставіцца да сваіх абавязкаў. Раскажыце казку паводле адной з сітуацый. Якія формулы маўленчага этыкету вы будзеце выкарыстоўваць?

**206.** Запішыце словазлучэнні ў тры слупкі ў адпаведнасці з тым, з якім гукам чаргуюцца зычныя ў аснове на ***г, к, х***: [г] // [з'], [к] // [ц], [х] // [с'].

Ляжаць у *(сумка)*, аб'явіць падзяку *(ткачыха)*, плыць на *(крыга)*, дом пры *(дарога)*, трымаць у *(рука)*, радзімка* на *(шчака)*, быць у *(скруха)*, ісці па *(сцяжынка)*, радавацца *(вавёрка[л])*, на каляровай *(дуга)* вясёлкі.

Знайдзіце слова, што мае значэнне ‘афіцыйная высокая ацэнка чыёй-небудзь работы’. Якія яшчэ значэнні мае гэта слова?

Падбярыце да яго аднакаранёвыя словы, разбярыце іх па саставе.

## § 33. Асаблівасці правапісу канчаткаў назоўнікаў 2-га скланення (у родным і месным склонах адзіночнага ліку)

**207.** Прачытайце тэкст. Вызначце яго асноўную думку. Падбярыце да тэксту загаловак.

Зіма — пара́ не толькі святкаванняў, але і **холаду** і прастуды. Засцерагчыся ад **грыпу** дапамогуць народныя рэцэпты.



Адным з самых галоўных сродкаў народнай медыцыны з'яўляецца **мёд**, які лечыць ад вялікай колькасці хвароб. Але самае галоўнае, што натуральны мёд — прыродны імунастымулятар. Маленькая лыжачка мёду нашча* і яшчэ адна, разведзеная ў шклянцы



Праваўладальнік Акадэмія адукацыі

цёплай вады ці малака, — на ноч перад **сном**. Майце на ўвазе: у гарачай вадзе мёд траціць прыродныя ўласцівасці! Пры прастудных захворваннях рэкамендуецца піць **адвар** ягад шыпшыны замест **чаю**.

Ад дрэннага **настрою** добра спяваць на прыродзе — у **лесе** ці на **лузе**. Нашы продкі верылі: калі пасля **абеду** прыкладна адну гадзіну спяваць песні на ўвесь голас, то ўсе дрэнныя думкі і кепскі настрой абавязкова пройдуць *(Паводле І. Казаковай)*.

Размяркуйце па групах выдзеленыя назоўнікі ў залежнасці ад значэння: 1) рэчывы; 2) стан прыроды ці чалавека; 3) прасторавыя паняцці; 4) хваробы; 5) дзеянні. Запішыце іх у форме роднага склону, выдзеліце канчаткі.

На аснове звестак з тэксту падрыхтуйце вуснае выказванне на тэму «Што нам раіць народная медыцына?» і выступіце з ім перад класам.

*на́шча*

**!**

Склонавыя канчаткі назоўнікаў 2-га скланення залежаць ад іх лексічнага значэння. Назоўнікі мужчынскага роду ў родным склоне могуць мець канчатак ***-у (-ю)*** або ***-а (-я)***.

Канчатак ***-у (-ю)*** маюць назоўнікі, якія абазначаюць:

- абстрактныя паняцці: *інтэлекту*, *поспеху*, *блакіту*;
- прасторавыя і часавыя паняцці: *лугу*, *краю*, *веку*, *перапынку*;
- рэчывы: *цукру*, *клею*, *шоўку* (а л е: *хлеба*, *аўса*);
- сукупнасць прадметаў ці асоб: *беразняку*, *народу*, *люду*;
- дзеянні, працэсы: *перапісу*, *масажу*, *нагрэву*;
- пачуцці, адчуванні: *сораму*, *спакою*, *жалю*;
- захворванні: *грыпу*, *інфаркту*, *радыкуліту*;
- з'явы прыроды, стыхіі: *грому*, *холаду*, *дажджу*;
- падзеі ў грамадскім жыцці: *фестывалю*, *кірмашу*, *форуму*.

Астатнія назоўнікі 2-га скланення маюць канчатак ***-а (-я)***: *зуба*, *рубля*, *алфавіта*.

**208.** Прачытайце табліцу. Запомніце групы назоўнікаў, якія ўжываюцца ў форме роднага склону адзіночнага ліку з канчаткам ***-а (-я)***.

| Лексіка-семантычныя групы назоўнікаў | Прыклады |
|---|---|
| **Назоўнікі мужчынскага роду** | |
| Навуковыя і тэхнічныя тэрміны | *дзейнік*[а], *артыкл*[я], *спектакл*[я] |
| Назвы жывых істот | *вожык*[а], *бусл*[а], *лас*[я] |
| Назвы канкрэтных прадметаў | *дом*[а], *кран*[а], *аўтамабіл*[я] |
| Назвы органаў, частак цела | *ілб*[а], *зуб*[а], *язык*[а] (а л е: *твар*[у]) |
| Назвы адзінак вымярэння, грашовых адзінак | *міліметр*[а], *літр*[а], *рубл*[я] |
| Назвы прамежкаў часу | *дн*[я], *вечар*[а], *год*[а] (а л е: *ранк*[у]) |
| Назвы месяцаў, дзён тыдня | *верасн*[я], *лістапад*[а], *аўторк*[а] |
| Назвы грамадскіх арганізацый, устаноў | *камітэт*[а], *савет*[а], *клуб*[а] |
| Назвы танцаў, гульняў | *балет*[а], *вальс*[а], *футбол*[а] |
| **Назоўнікі ніякага роду** | *возер*[а], *сял*[а], *збожж*[а] |

Падрыхтуйце паведамленне пра канчаткі назоўнікаў мужчынскага і ніякага роду ў родным склоне адзіночнага ліку.

**209.** Са слоў складзіце прыказкі, паставіўшы назоўнікі ў патрэбную форму. Запішыце сказы. Растлумачце правапіс канчаткаў.

1. Аўчына, выраб, не варта. 2. Лыжка, дзёгаць, псуе, мёд, бочка. 3. Адзін, з'еш, хоць, вол, адна, хвала. 4. Без, хлеб, яда, да, парог, хада. 5. Дождж[ф], не, просяць, як, жнуць, косяць, ды.

Знайдзіце прыказку, якая мае значэнне 'справа не варта патрачаных на яе сіл і сродкаў'. Успомніце і раскажыце пра выпадак, калі было б дарэчным ужыванне гэтай прыказкі.

## *Гавары і пішы правільна*

У залежнасці ад значэння некаторыя назоўнікі могуць ужывацца з канчаткамі **-*а* (-*я*)** і **-*у* (-*ю*)**: *голле старога дуб*[а] — *стол з дуб*[у], *каля маладога ясен*[я] — *мэбля з ясен*[ю] (назоўнікі набываюць значэнне рэчыўных); *ішлі па сцежках сад*[а] — *у канцы сад*[у] (назоўнік набывае прасторавае значэнне).



Праваўладальнік Акадэмія адукацыі

**210.** Прачытайце табліцу і раскажыце аб правапісе канчаткаў назоўнікаў мужчынскага роду 2-га скланення ў месным склоне. Прывядзіце свае прыклады, паставіўшы назоўнікі з папярэдняга практыкавання ў форму меснага склону.

<table>
<tr><th rowspan="5">Месны склон</th><th colspan="4">Назоўнікі з асновай</th></tr>
<tr><th>на цвёрды зычны</th><th>на зацвярдзелы зычны</th><th>на мяккі зычны</th><th>на г, к, х</th></tr>
<tr><td>-е<br>(на) мосце<br>(у) небе</td><td>-ы<br>(на) дожджы<br>(у) гушчары<br>(на) возеры</td><td>-і<br>(на) фестывалі<br>(у) ручаі<br>(у) полі</td><td>-е<br>[г]//[з’]<br>(на) беразе<br>[х]//[с’]<br>на версе</td></tr>
<tr><th colspan="4">Назоўнікі маюць канчаткі -у, -ю:</th></tr>
<tr><td colspan="2">калі абазначаюць асобу чалавека: (пры) урачу, (аб) вучню, (пры) Алегу;<br>а л е: назоўнікі з асновай на цвёрды зычны могуць ужывацца і з канчаткам -е:<br>(пры) суседзе, (пры) браце</td><td colspan="2">калі апошнія зычныя асновы г, к, х не чаргуюцца з з, ц, с: (на) мітынгу, (аб) насарогу; у сшытку, (у) жаху</td></tr>
</table>

**211.** Спішыце тэкст, устаўляючы прапушчаныя літары. Абазначце канчаткі і вызначце склон назоўнікаў 2-га скланення, растлумачце правапіс канчаткаў.

Зверабой — «л..карства ад ста хвароб», як гавораць у народз.. . Гэту расліну называюць яшчэ святая́ннік. Ён з род.. раслін сямейства зверабойных. Жоўтыя кветачкі зверабо.. сабраны ў суквецц.. . Яго лісце можа стаць асновай[л] для добрага і карыснага ча.. . Разламі яго тонкую сц..блінку — і на злом.. выступіць ч..рвонакр..вавы сок. Таму зверабо.. прыпісваюць і магічныя ўласцівасці (*Паводле Х. Гурыновіча*).

Растлумачце правапіс літар ***е, ё, я*** ў корані слова.

Чаму зверабой называюць «лякарствам ад ста хвароб»? Як вы думаеце, чаму гэта расліна атрымала такую назву?

**212.** Выканайце інтэрактыўнае заданне па тэме «Канчаткі назоўнікаў 2-га скланення ў месным склоне».